Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 247 (316) ЧАЦВЕР 24 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

Цана 10 капеек.

АСНОЎНАЕ Ў РАБОЦЕ КОМСАМОЛА

Нядаўна адбыўся XIV з'езд Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі. З'езд падвёў вынікі праробленай работы і, кіруючыся рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б), указаннямі правадыра народаў таварыша Сталіна, вызначыў далейшыя задачы ў сваёй рабоце.

XIV з'езд ЛКСМБ у сваіх рашэннях адзначыў, што «Комсамольская арганізацыя Беларусі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі дабілася значных поспехаў на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва і прышла да свайго XIV з'езда ідэйна і арганізацыйна ўмацаваўшайся, маналітнай, цесна згуртаванай вакол роднай большэвіцкай партыі і нашага вялікага правадыра таварыша Сталіна. Вырасла палітычная і працоўная актыўнасць комсамольцаў і моладзі Беларусі».

Комсамольская арганізацыя нашай вобласці сваім актыўным удзелам у гаспадарчай і дзяржаўнай рабоце дае прыклад комуністычных адносін да працы — гэтага асноўнага абавязку совецкага грамадзяніна. Комсамольска-маладзёжныя брыгады на тэкстыльных прадпрыемствах, на транспарце, у лесаапрацоўчай прамысловасці па праву займаюць вядучае месца. Актыўны ўдзел у стаханаўскім руху, побач з настойлівай вучобай, з'яўляецца цяпер асноўным паказчыкам у рабоце комсамольскіх арганізацый.

Характэрнай рысай комсамольска-маладзёжных брыгад з'яўляецца зладжанасць у рабоце, таварыская ўзаемадапамога. На 5-м тэкстыльным камбінаце брыгада складаецца з 15 чалавек. За першую палову кастрычніка месяца вытворчы план ёю выкапан на 106,5 процанта. Маладыя ткачы тт. Іовін і Сланімскі выконваюць план на 126 процантаў, М. Без, Беластоцкі — звыш чым на 115 процантаў. Добра працуе комсамольска-маладзёжная брыгада і на 1-м тэкстыльным камбінаце. Яе брыгадзір — ткач-чатырохстаночнік тав. Меламед выконвае норму на 111 процантаў. Не адстаюць ад яго і ткачы тав. Бахрах, Тыкоцкі. Брыгада, якая складаецца з 12 чалавек, дабілася высока-прадукцыйнага выкарыстання станкоў. Прастоі станкоў зведзены да 2-х процантаў ад усяго рабочага часу. На беластоцкім чыгуналіцейным заводзе бацька Міхаіл Дайліда спаборнічае з сваімі двума сынамі — Станіславам і Казімірам. Усе яны ў паўтары—два разы перавыконваюць нормы выпрацоўкі.

Працаваць на поўны разварот сваіх здольнасцей, яўляць узор працоўнай дысцыпліны, уменне поўнасцю выкарыстаць абсталяванне, выдаваць прадукцыю высокай якасці—усё гэта становіцца правілам комсамольцаў і моладзі, якая працуе ў соцыялістычнай прамысловасці.

Задача комсамольскіх арганізацый — усямерна і далей павышаць сваю вытворчую актыўнасць, быць перадавікамі ў соцыялістычным спаборніцтве. Гэтага патрабуе ад кожнага комсамольца XIV з'езд ЛКСМБ. «XIV з'езд комсамола Беларусі абавязвае ўсе комсамольскія арганізацыі забяспечыць няўхільнае выкананне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года, рашуча змагацца з дэзарганізатарамі вытворчасці, раскрадвальнікамі соцыялістычнай уласнасці, бракаробамі, поўнасцю ліквідаваць прагулы і прастоі, паўсядзённа ўмацоўваць дзяржаўную і комсамольскую дысцыпліну, забяспечыць далейшы ўздым стаханаўскага руху сярод комсамольцаў і моладзі рэспублікі».

У радах нашай абласной комсамольскай арганізацыі ёсць яшчэ выпадкі праяўлення недысцыплінаванасці. Так, комсамолка, піонерважатая Венсошскай школы, Граеўскага раёна, Іванова самавольна пакінула работу ў школе. Яна-ж, на вялікі жаль, з'яўлялася выхавальніцай піонераў. Такія ганебныя ўчынкі асобных комсамольцаў комсамольская арганізацыя не павінна цярпець у сваіх радах. Комсамолец-актывіст павінен яўляць сабой сапраўдны ўзор большэвіцкай дысцыплінаванасці, быць комуністычна выхаваным. Дасягненне гэтага з'яўляецца цэнтральнай задачай у рабоце комсамольскай арганізацыі. Вось што аб гэтым сказаў XIV з'езд комсамола Беларусі: «Адносіны да соцыялістычнай працы павінны быць пакладзены ў аснову ацэнкі маральных якасцей кожнага комсамольца, які павінен інтарэсы соцыялістычнай дзяржавы ставіць вышэй за ўсё». У практычным ажыццяўленні рашэнняў XIV з'езда ЛКСМБ гэтае пытанне павінна займаць галоўнае месца ў паўсядзённай рабоце кожнай комсамольскай арганізацыі.

Велізарную практычную работу комсамольская арганізацыя павінна разгарнуць у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Комсамол нашай вобласці ўжо мае вялікі вопыт работы. Тысячы комсамольцаў і моладзі праводзілі агітацыйную работу, удзельнічалі ў выбарчых камісіях у час выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Безумоўна, колькасць комсамольцаў-агітатараў і ўдзельнікаў у выбарчых камісіях значна ўзрасце ў кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Трэба, каб у гэтай важнейшай палітычнай кампаніі комсамол паказаў прыклад упорнай большэвіцкай работы. Трэба, каб кожная комсамольская арганізацыя поўнасцю ажыццявіла пастанову XIV з'езда ЛКСМБ аб тым, што «неабходнаператварыць масавую агітацыю ў магутную зброю барацьбы за большэвіцкае выкананне рашэнняў нашай партыі і ўрада. Усім комсамольскім арганізацыям карэнным чынам палепшыць справу антырэлігійнай прапаганды і інтэрнацыянальнага выхавання моладзі. Камітэтам комсамола заходніх абласцей Беларусі рашуча палепшыць палітыка-выхаваўчую работу сярод моладзі».

Няма сумнення, што пад кіраўніцтвам партыі комсамольскія арганізацыі рашэнні XIV з'езда ЛКСМБ выканаюць па-большэвіцку.

ГАРАДСКІ І РАЁННЫ КОМСАМОЛЬСКІЯ СХОДЫ Ў ГРОДНЕ

ГРОДНА. **(Ад нашага карэспандэнта).** 20 і 21 кастрычніка адбыліся агульныя сходы комсамольскіх арганізацый горада і раёна, прысвечаныя вынікам работы XIV з'езда ЛКСМБ. Даклад аб рабоце з'езда на раённым сходзе зрабіў член бюро райкома комсамола тав. Сердзюкоў, на гарадскім сходзе—сакратар гаркома ЛКСМБ тав. Кузьмін. У спрэчках выступілі сакратар абкома комсамола тав. Скрыжак, старшыня Копцеўскага сельсовета, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Лашак, камсорг 2-й школы тав. Архірэева і іншыя.

Выступаючыя на сходах у спрэчках адзначылі, што комсамольскія арганізацыі правільна зразумелі пастаўленыя перад імі задачы. Сваю выхаваўчую работу сярод несаюзнай моладзі яны ўмела спалучаюць з гаспадарчай дзейнасцю комсамольцаў на вытворчасці, у калгасах. Уступаючая днямі ў эксплаатацыю шасейная дарога Гібулічы—Квасаўка пабудавана па ініцыятыве маладых патрыётаў.

Але ў рабоце комсамольскіх арганізацый нямала ёсць і недахопаў. Дрэнна разгорнута барацьба за выкананне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. На хлебакамбінаце лік прагулаў сярод моладзі не зменшыўся. Комсамольская арганізацыя гэтага камбіната (сакратар тав. Шпіндлер) нічога не зрабіла, каб дапамагчы адміністрацыі хутчэй ліквідаваць прагулы і спазненні.

Зараз комсамольцы раёна і горада актыўна ўключыліся ў выбарчую кампанію. На веласіпедным заводзе комсамольцы-агітатары тт. Атлас, Кастрова, Ліпец і іншыя прыступілі да растлумачэння сярод рабочых выбарчага закона.

Усяго агітатарамі і членамі выбарчых камісій будуць працаваць звыш двух тысяч комсамольцаў.

У прынятых рэзалюцыях комсамольцы раёна і горада адобрылі рашэнні XIV з'езда ЛКСМБ і абавязаліся па-большэвіцку іх ажыццявіць.

Г. Лупсякоў.

АБ ПЕРАПАШЦЫ БУЛЬБЫ Ў КАЛГАСАХ І СОЎГАСАХ

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ

СНК БССР і ЦК КП(б)Б лічаць няправільным, што старшыні многіх калгасаў і дырэктары соўгасаў пад прадлогам недахопу рабочай сілы і цягла, баранаванне і перапашку плошчаў пасля ўборкі бульбы адкладваюць на апошнюю чаргу, дапушчаючы тым самым вялікія страты ўраджаю бульбы.

СНК БССР і ЦК КП(б) Беларусі пастанаўляюць:

1. Баранаване і ўслед за баранаваннем збор бульбы, перапашка і ўслед за перапашкай збор бульбы з'яўляюцца абавязковымі для кожнага калгаса і соўгаса.

Устанавіць тэрмін заканчэння гэтай работы 1-га лістапада 1940 года.

Абавязаць праўленні калгасаў і дырэктараў соўгасаў для баранавання і перапашкі бульбы выдзеліць дастатковую колькасць рабочай сілы і цягла і закончыць гэту работу ва ўстаноўлены тэрмін.

2. Абавязаць РК КП(б) Беларусі і выканкомы раённых Советаў дэпутатаў працоўных арганізаваць баранаванне і перапашку бульбы ў кожным калгасе і соўгасе і забяспечыць паўсядзённы кантроль за выкананнем гэтай пастановы.

Старшыня СНК БССР БЫЛІНСКІ.

Сакратар ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ ПАНАМАРЭНКА.

Вялікая актыўнасць працоўных

(Гутарка з сакратаром Граеўскага райкома партыі тав. С. І. Тарасевічам).

Працоўныя нашага раёна пачатак выбарчай кампаніі сустрэлі як радасную падзею. Аб гэтым ярка гавораць праходзіўшыя мітынгі і сходы, прысвечаныя абмеркаванню Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб дні выбараў. З вялікай актыўнасцю прайшлі сходы грамадскіх арганізацый, на якіх вылучаліся прадстаўнікі ў састаў выбарчых камісій. У камісіі пасланы лепшыя правераныя людзі.

Зараз па раёну заканчваецца работа па вызначэнню выбарчых акруг. Зацверджана раённая і гарадская выбарчыя камісіі па выбарах у раённыя і гарадскія Советы. У саставе выбарчых камісій будзе працаваць больш 2 тысяч чалавек. Ва ўсіх сельсоветах пачалася работа па падрыхтоўцы да складання спіскаў выбаршчыкаў. Праводзіцца ўдакладненне нумерацыі дамоў, дамавых кніг.

Партыйная арганізацыя ўдзяляе вялікую ўвагу пытанням разгортвання агітацыйна-масавай работы сярод насельніцтва. Пры райкоме партыі праведзен семінар кіраўнікоў агіткалектываў і сакратароў пярвічных партыйных арганізацый, у сельсоветах праведзены семінары агітатараў.

Больш 200 агітатараў прыступілі ўжо да агітацыйна-масавай работы. Тт. Бабрыкава, Селінкоў, Паўловіч, Сканецкі, Свідэрская і многія іншыя вывучаюць з выбаршчыкамі Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах.

Пачатак выбарчай кампаніі выклікаў новы вытворчы ўздым сярод рабочых, калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў. З кожным днём шырыцца перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва. У бліжэйшыя дні поўнасцю закончацца ўсе асеннія сельскагаспадарчыя работы. Калектыў работнікаў граеўскай МТС дабіўся перавыканання гадавога плана трактарных работ. У калгасах закончана копка бульбы і падняцце зябліва. Калгасы разлічыліся з дзяржавай па абавязковых пастаўках, заканчваецца пастаўка бульбы дзяржаве.

Нарада старшынь горвыканкомаў і райвыканкомаў

У абласным выканаўчым камітэце адбылася нарада старшынь гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў па пытаннях падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На нарадзе абмеркаваны вынікі работы па стварэнню выбарчых акруг у абласныя, гарадскія, раённыя, сельскія і пасялковыя Советы.

Ва ўсіх раёнах праводзіцца вялікая работа. Па выбарах у абласны Совет створаны 93 акругі, у горсаветы абласнога падпарадкавання (Ломжа, Гродна, Беласток) — 488 акруг, у горсаветы раённага падпарадкавання — 358 акруг, райсоветы — 1.060, сельскія і пасялковыя советы — 8.651 акруга.

У выбарчыя акруговыя камісіі вылучана каля 75 тысяч чалавек.

На нарадзе выступілі старшыня Гродненскага горвыканкома тав. Ратайка, Ломжынскага райвыканкома тав. Данілаў, Граеўскага райвыканкома тав. Недзеўдскі і іншыя.

Нарада намеціла рад канкрэтных мерапрыемстваў па стварэнню выбарчых участкаў і работы ўчастковых выбарчых камісій.

Разгарнулі работу

З вялікім уздымам прайшлі мітынгі па Заблудаўскаму раёну, прысвечаныя пачатку выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Па ўсяму раёну праходзіць вялікая работа па стварэнню выбарчых акруг і ўчасткаў, вылучэнню састава выбарчых камісій ад партыйных, комсамольскіх, профсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый.

1.500 агітатараў прымаюць удзел у агітацыйнай рабоце сярод насельніцтва па выбарчых участках. Праведзены семінары з кіраўнікамі агіткалектываў.

А. Лебедзеў.

У масавай рабоце пры ме ўдзел 8 тысяч актывістаў

ЗАМБРАВА. **(Па тэлефону).** У Замбраўскім раёне прыступілі да састаўлення спіскаў выбаршчыкаў.

Як толькі быў апублікаван Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб выбарах і дастаўлены ў Замбрава газеты, раённы камітэт партыі правёў семінар кіраўнікоў агіткалектыў. На семінары была дана ўстаноўка, як і з чаго пачынаць агітацыйную работу.

У некаторых сельсоветах і выбарчых участках пачалі вывучаць Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Першыя арганізацыйныя заняткі былі праведзены ў Шэдрухскім сельсовеце.

Кіраўнік агіткалектыва тав. Ніхеенка правяла сход выбаршчыкаў першага і другога выбарчых участкаў, азнаёміла іх з Палажэннем аб выбарах і парадкам правядзення выбарчай кампаніі. На сходзе прысутнічала больш 150 чалавек.

Да актыўнай работы па выбарах будзе прыцягнута каля 8 тысяч чалавек.

ВЫВУЧАЮЦЬ ВЫБАРЧЫ ЗАКОН

ВАЎКАВЫСК. **(Ад нашага карэспандэнта).** У калгасе імені Першага Мая, Мсцібаўскага сельсовета, разгарнулася работа па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона.

— Калгаснікі—паведамляе старшыня калгаса Сеўко,—праяўляюць вялікую зацікаўленасць да работы гуртка, настойліва ўзяліся за вывучэнне Канстытуцыі БССР і Палажэння аб выбарах.

У гуртку, якім кіруе старшы механік машынна-трактарнай станцыі Халяўскі, адбылося трое заняткаў. Заняткі прайшлі жыва і арганізавана. Кіраўнік гуртка даходчывай мовай падрабязна растлумачвае наведвальнікам кожны артыкул выбарчага закона. Добрая работа гуртка прыцягнула ўвагу калгаснікаў. На заняткі з кожным разам усё больш і больш прыходзіць новых людзей. На апошніх занятках прысутнічала каля 30 выбаршчыкаў.

Д. Казлоў.

Аб мерапрыемствах па рэалізацыі Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і пастановы СНК СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Совет Народных камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і размеркаваннем працоўных рэзерваў у рэспубліцы арганізаваць пры Соўнаркоме БССР Упраўленне Працоўных Рэзерваў.

2. Ускласці на рэспубліканскае Упраўленне Працоўных Рэзерваў пры СНК БССР падрыхтоўку працоўных рэзерваў для прамысловасці і транспарта.

3. Зацвердзіць сетку і кантынгенты навучаючыхся ў рамесленых вучылішчах, чыгуначных вучылішчах і школах ФЗА (згодна дадаткаў №№ 1, 2, 3).

4. Даручыць рэспубліканскаму Упраўленню Працоўных Рэзерваў пры СНК БССР к 20 кастрычніка 1940 года ўнесці на зацверджанне СНК БССР:

а) план падрыхтоўкі працоўных рэзерваў па прафесіях;

б) каштарыс расходаў на ўтрыманне арганізуемых рамесленых вучылішч, чыгуначных вучылішч і школ фабрычна-заводскага абучэння на 1940—1941 год;

в) прапановы аб забеспячэнні навучаючыхся рамесленых вучылішч, чыгуначных вучылішч і школ фабрычна-заводскага абучэння падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, інтэрнатамі, вопраткай, абуткам, бялізнай, пасцельнымі прыладамі, харчаваннем і вучэбна-вытворчымі памяшканнямі;

г) структуры і штат рэспубліканскага Упраўлення Працоўных Рэзерваў;

5. Перадаць у веданне Упраўлення Працоўных Рэзерваў пры СНК БССР:

а) існуючыя школы фабрычна-заводскага вучнёўства згодна дадатка № 4;

б) прыняць прапановы аблвыканкомаў аб перадачы вучэбных і вытворчых памяшканняў і інтэрнатаў з ведання наркаматаў і ведамстваў Упраўленню Працоўных Рэзерваў пры СНК БССР.

Перадачу правесці па балансу на 1 жніўня 1940 года з вучэбна-вытворчымі памяшканнямі, абсталяваннем, інтэрнатамі, а таксама з наяўным саставам штата выкладчыкаў і навучаючыхся.

6. Абавязаць наркаматы і дырэктараў прадпрыемстваў у двухтыднёвы тэрмін аслабаніць перададзеныя памяшканні рамесленым, чыгуначным вучылішчам і школам фабрычна-заводскага абучэння.

7. Перадаць у веданне Упраўлення Працоўных Рэзерваў пры СНК БССР завод імені Варашылава Наркаммясцпрома БССР у гор. Бабруйску.

8. Абавязаць аблвыканкомы забяспечыць своечасовую падрыхтоўку к пачатку вучэбнага года школ ФЗА, рамесленых вучылішч і чыгуначных вучылішч.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР І. БЫЛІНСКІ.

Упраўляючы Справамі Совета Народных Камісараў БССР І. БАНЦЫРЭЎ.

16 кастрычніка 1940 г.
г. Мінск.

* * *

Згодна пастанове СНК БССР ад 16 кастрычніка г. г., па Беластоцкай вобласці арганізуецца на базе былога рамесленага вучылішча ФЗВ Наркаммясцпрома рамесленае вучылішча ў горадзе Гродне на 350 навучаючыхся.

У горадзе Беластоку арганізуецца чыгуначнае вучылішча на 200 навучаючыхся на базе школы ФЗВ.

Школы ФЗА будаўнікоў арганізуюцца ў наступных гарадах Беластоцкай вобласці: у Ломжы (памяшканне пры аблбудтрэсце) — на 160 чалавек, у Беластоку (памяшканне пры аблбудтрэсце) — на 300 чалавек і ў Саколках (памяшканне пры Упасдоры) — на 150 чалавек.

У веданне Упраўлення Працоўных Рэзерваў пры СНК БССР пераходзяць: школа ФЗВ металістаў у Гродне — ад Наркаммясцпрома і школа ФЗВ Беластоцкай чыгункі ў Беластоку — ад Наркамата шляхоў зносін.

ВЫТВОРЧЫМІ ПАДАРУНКАМІ РАДЗІМЕ СУСТРЭНЕМ XXIII ГАДАВІНУ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Да свята—дзве тысячы веласіпедаў

ГРОДНА. **(Ад нашага карэспандэнта.)** У сярэдзіне гэтага года гродненскі веласіпедны завод аднавіў выраб веласіпедаў. Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, рабочы калектыў завода абавязаўся дастойна адзначыць вялікае свята. За другую палову кастрычніка рабочыя абавязаліся выканаць двухмесячную вытворчую праграму і даць краіне 1.600 веласіпедаў. Да слаўнай гадавіны Кастрычніка завод дасць звыш плана 2 тысячы веласіпедаў і 300 дзіцячых калясак.

Завод асвоіў выпуск раду дэталей для веласіпедаў. Усе машыны для выпуску гэтых дэталей зроблены на месцы інструментальным цэхам. Вялікая работа па выпуску новых машын праробленна слесарамі-інструментальшчыкамі тт. Кульбацкім і Мандалес.

Свае абавязацельствы калектыў падмацоўвае канкрэтнымі справамі. Зборачны цэх (начальнік цэха тав. Атлас) штодзённа выконвае свой план на 200 процантаў, выпускаючы 100 веласіпедаў. Цэх ширспажыву штодзённа дае 180 процантаў сваёй нормы, брыгада тав. Ліпеца выконвае план на 200 процантаў.

Калектыў рабочых абавязаўся за канца года даць краіне 10 тысяч веласіпедаў.

ЛЕСАРУБЫ РЫХТУЮЦЦА ДА СВЯТА

Лесарубы беластоцкага Леспрамгаса разгарнулі дзейную падрыхтоўку да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. На Катрынскім лесаўчастку многія лесарубы значна перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Тав. Б. Трызноўскі замест 12 норм за 2 тыдні дае 22 нормы. Такія-ж паказчыкі даюць лесарубы З. Трызноўскі і Луцкевіч. Добрых рэзультатаў дабіліся таксама Радзішэўскі і Карэнкевіч.

«о»

Стаханаўцы вылучаны членамі выбарчых камісій

Клуб 6-га тэкстыльнага камбіната перапоўнен рабочымі, якія сабраліся сюды, каб вылучыць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі.

Старшыня заводскага камітэта тав. Пшыбыляк адкрывае сход. Першым бярэ слова рабочы тав. Філіпчак. Ён прапануе вылучыць прадстаўнікамі ў акруговыя камісіі па выбарах у абласны Совет таварышоў: Клейна—старага рабочага, ткача-двухстаночніка, тав. Гайдоўскага — профарганізатара цэха і стаханаўца-двухстаночніка, члена фабкома тав. Венгера.

Сход аднагалосна падтрымаў гэтыя кандыдатуры.

У акруговыя камісіі па выбарах у гарадскі Совет вылучан Іван Сямёнавіч Хрэноўскі, лепшы стаханавец, актывіст выбарчай кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Тав. Хрэноўскі дырэкцыяй камбіната прадстаўлен да ўзнагароды значком соцыялістычнага спаборніцтва тэкстыльшчыкаў.

Затым вылучаецца Вера Іванаўна Рашко—адна з першых стаханавак камбіната. Тав. Рашко першая перайшла на ўшчыльненае абслугоўванне (замест тыпавых 165 верацён працуе на 259). Яна таксама прадстаўлена да ўзнагароды. Не адстаюць ад яе па рабоце Рэгіна Гаўрылаўна Жабукліцкая, Зінаіда Аляксандраўна Гайдук, Ніна Андрэеўна Банашэк. Яны таксама вылучаны ў выбарчыя камісіі.

Р. Кісельман.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Штодзённа і канкрэтна працаваць з кандыдатамі

Ломжынская партыйная арганізацыя налічвае ў сваіх радах 84 кандыдаты КП(б)Б. Гэта больш адной трэці ўсёй парторганізацыі.

Раённая партыйная канферэнцыя абавязала райком КП(б)Б больш удзяляць увагі выхаванню кандыдатаў партыі. Выконваючы рашэнне канферэнцыі, райком і пярвічныя арганізацыі, асабліва ў апошні час, сталі сур'ёзна і канкрэтна займацца гэтай важнейшай справай.

Сакратар парторганізацыі міліцыі тав. Радзіонаў дапамагае кандыдатам у выкананні імі партыйных даручэнняў, сістэматычна праводзіць гутаркі з кандыдатамі, цікавіцца іх палітычным ростам.

Нядрэнна пастаўлена работа з маладымі камуністамі і кандыдатамі партыі. раду іншых арганізацый.

У райвыканкоме, напрыклад, усе камуністы маюць партыйныя даручэнні, прымаюць актыўны ўдзел у партыйнай і грамадскай рабоце. Кандыдат партыі тав. Пархоменка паказвае добрыя прыклады ў праядзенні масава-палітычнай работы. Ён арганізаваў пры Гжэмала-Шчэпанкоўскім сельсовеце агіткалектыў, прыцягнуў у яго састаў мясцовых таварышоў.

Тое-ж можна сказаць і аб партарганізацыі райспажывсаюза. Кандыдат партыі тав. Світкін сістэматычна праводзіць чыткі газет з супрацоўнікамі райспажывсаюза, добра наладзіў работу профсаюзнай арганізацыі, працуе над павышэннем свайго тэарэтычнага ўзроўню. Малады кандыдат тав. Леановіч таксама сістэматычна працуе над сабой, зараз вывучае VII раздзел «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», чытае мастацкую літаратуру. Тт. Леўкоў, Кажамякін і іншыя таварышы паказваюць добрыя прыклады ў рабоце над сабой і ў партыйна-масавай рабоце.

Райком партыі нядаўна правёў нараду кандыдатаў партыі. На нарадзе кандыдаты выказалі свае пажаданні аб паляпшэнні работы з імі. Пазней адбылася пры райкоме нарада сакратароў пярвічных арганізацый, на якой былі намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па рабоце з кандыдатамі.

У апошні час практыкуецца вызаў асобных кандыдатаў у райком для гутаркі. Гэтыя гутаркі прыносяць кандыдатам вялікую карысць.

Аднак у ломжынскай арганізацыі ёсць і значныя недахопы. Каля 20 кандыдатаў маюць пратэрмінаваны стаж. Сярод іх, на жаль, ёсць і такія таварышы, якія не падрыхтаваліся для ўступлення ў члены партыі. Тав. Пальчык, напрыклад, з'яўляецца кандыдатам з 1938 года, зусім не працуе над сабой, не ведае, з якога года існуе большэвіцкая партыя, не чытаў статута партыі, а аб «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)» ведае толькі, што ёсць такая кніга. Другі кандыдат тав. Варонін таксама слаба працуе над сабой.

Кандыдацкі стаж мае вялікае значэнне, ён з'яўляецца сур'ёзнай праверкай для кожнага ўступаючага ў члены ВКП(б). Каб дапамагчы кандыдату партыі добра выкарыстаць свой кандыдацкі стаж, каб дапамагчы яму своечасова падрыхтавацца да ўступлення ў члены КП(б)Б, партыйным арганізацыям і іх кіраўнікам трэба палыхоліць да кожнага таварыша індывідуальна, трэба штодзённа і канкрэтна працаваць з кожным таварышом, аказваць яму практычную дапамогу ў справе палітычнага росту і палітычнай загартоўкі.

С. Мірончык,
сакратар Ломжынскага райкома КП(б)Б.

Вечар пытанняў і адказаў

Да апошняга часу асноўнай формай агітацыйна-масавай работы на прадпрыемствах і ва ўстановах у нас з'яўляліся гутаркі агітатараў, даклады і папулярныя лекцыі, але, як правіла, без уліку пытанняў рабочых і служачых. Днямі ўпершыню у горадзе Гродна на шклозаводзе быў праведзен вечар адказаў на пытанні рабочых і служачых. За 10 дзён да гэтага вечара агітатарам завода даручылі правесці гутаркі у сваіх групах аб прадстаячым сходзе, вывесілі скрынку для пытанняў. За чатыры дні паступіла 92 пытанні, розныя па свайму характару. Тут былі пытанні унутрызаводскага характару, унутранага становішча нашай краіны. Самая вялікая колькасць пытанняў была аб міжнародным становішчы. Вось некаторыя з зададзеных пытанняў.

— Чаму так доўга няма занятак па ППХА?

— Куды можна паступіць на завочнае абучэнне па электратэхніцы?

— Якая розніца паміж калгасам і саўгасам?

— У чым агрэзненне сацыялізма ад камунізма?

— Якія ўзаемаадносіны СССР з Германіяй?

— Хто з'явіцца пераможцам у англа-германскай вайне?

Зададзеныя пытанні за некалькі дзён да сходу былі разданы дакладчыкам. У дзень сходу ў чырвоным кутку завода для рабочых другой змены была арганізавана кансультацыя. Кансультаваў палітрук тав. Сарочкін.

Сакратар партарганізацыі завода тав. Балык адкрываючы вечар пытанняў і адказаў, коратка растлумачыў яго задачы і прадаставіў слова для адказаў дырэктару завода тав. Касперовічу. Ён зачытваў кожнае пытанне (унутрызаводскага характару), даваў вычарпальныя, зразумелыя адказы. Добра падрыхтаваўся да даклада тав. Сарочкін. Карыстаючыся палітычнай картай Еўропы, ён папулярна і глыбока растлумачыў знешнюю міжнародную абстаноўку і выцякаючыя з яе задачы савецкага народа. Вечар працягваўся больш 2-х гадзін. Рабочыя прасілі рэгулярна арганізоўваць вечары адказаў на пытанні.

Выкарыстоўваючы першы вопыт, мы мяркуем у бліжэйшы час правесці такія-ж сходы на іншых прадпрыемствах.

С. Навіцкая,
загадчык парткабінета Гродненскага гаркома КП(б)Б.

На справаздачных сходах пярвічных партарганізацый

НА 5-м ТЭКСТЫЛЬНЫМ КАМБІНАЦЕ

Справаздачны даклад зрабіў сакратар партыйнай арганізацыі тав. Глухоўскі.

Слабую палітыка-масавую работу сярод рабочых дакладчык апраўдваў адсутнасцю клуба і чырвонага кутка. Тав. Глухоўскі нічога не сказаў аб праведзеных у цэхах гутарках, не паказаў работу агітатараў. Аб партыйнай асвеце камуністаў ён сказаў наступнае:

— За пяць месяцаў сабраліся два разы, спыталі, хто які раздзел гісторыі партыі вывучае.

Яшчэ горш пастаўлена работа з камсамолам.

— Усяго камсамольцаў,—гаворыць тав. Глухоўскі, — на камбінаце налічваецца 49, з іх нова-прынятых з мясцовай моладзі — 13.

Выступіўшы ў спрэчках кандыдат партыі тав. Лапцеў даў даведку, што камсамольская арганізацыя састаіць з 12 чалавек, з якіх нова-прынятых — 6. Сакратар партарганізацыі не ведае нават, колькі камсамольцаў на камбінаце!

Тав. Лапцеў у сваім выступленні указаў таксама на тое, што ў арганізацыі дрэнна абстаіць справы з вывучэннем марксісцка-ленінскай тэорыі. Многія спасылаюцца на недахоп часу. Але гэтыя спасыланні не маюць ніякіх падстаў.

Сакратар партарганізацыі не кантралюе, як камуністы працуюць над самаадукацыяй, не аказвае ім дапамогі.

Тав. Гінепфельд (намеснік галоўнага інжынера) гаварыў аб недастатковай сувязі камуністаў з рабочым калектывам.

Сход прайшоў неарганізавана і закончыў сваю работу, не прыняўшы нават рэзалюцыі.

У АБЛАСНЫМ АДДЗЕЛЕ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ

Адбыўся справаздачны сход партыйнай арганізацыі абласнога аддзела народнай асветы. Сакратар партарганізацыі тав. Якаўлеў спыніўся на тым, што камуністы аблана недастаткова вялі барацьбу за ажыццяўленне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня. У аддзеле не зжыты прагулы і спазненні.

Гаворачы аб партыйнай прапагандзе, дакладчык адзначыў, што за справаздачны перыяд камуністы ў вывучэнні «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» дайшлі толькі да кастрычніцкага перыяда.

Выступаючыя ў спрэчках таварышы гаварылі аб дрэннай пастаноўцы партыйнай прапаганды, аб слабым кантролі з боку сакратара над камуністамі, якія самастойна вывучаюць гісторыю партыі.

— Некаторым камуністам даваліся даручэнні, але іх выкананне не правяралася, — гаворыць тав. Бухтар. — Некаторыя камуністы зусім не маюць партыйных даручэнняў.

Сход прыняў рашэнне, у якім ацаніў работу партарганізацыі за справаздачны перыяд здавальняючай. Адзначыўшы дасягнутыя поспехі ў рабоце, сход указаў на рад недахопаў і намеціў мерапрыемствы па паляпшэнню работы ў далейшым.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ



На тактычных вучэннях у часцях Заходняй асобай ваеннай акругі. На здымку: гарматны разлік малодшага камандзіра тав. Фёдарава за баявой стральбой. Фота-хроніка БелТА.

ВЯЛІКАМУ СВЯТУ ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ

Шырока разгарнулася перадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва ў Н-скай часці. Байцы і малодшыя камандзіры дзейна рыхтуюцца сустрэць слаўную гадавіну новымі дасягненнямі.

Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва, чырвонаармеец тав. Лабачоў абавязаўся засвоіць пройдзенае на палітзанятках тэмы на «выдатна».

Змагаючыся за выдатнае аўладанне воінскай спецыяльнасцю, чырвонаармеец тав. Сергоў дабіваецца з кожным днём усё новых і новых поспехаў.

У сваім падраздзяленні ён заслужана лічыцца адным з лепшых стралкоў. У стральбах, якія нядаўна праходзілі, ён выбіў 28 ачкоў з 30 магчымых.

Ленінскі пакой падраздзялення да свята будзе ўпрыгожан новымі мастацка выказанымі мантажамі на тэмы: «Гераічны шлях Чырвонай Арміі», «Чырвоная Армія на абароне рубяжоў краіны сацыялізма», «Наша радзіма за 23 годы». Рыхтуецца дошка выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі — перадавых людзей падраздзялення.

Ал. Окунеў.

Рыхтуем сустрэчу маладым байцам

У падраздзяленні ідзе дзейная падрыхтоўка да сустрэчы новага папаўнення. Адведзена памяшканне, у якім расстаўлены ложкі, тумбачкі, набіты матрацы, сцены ўпрыгожаны партрэтамі і лозунгамі, закуплены жывыя кветкі. Для маладых байцоў падрыхтаван ленінскі пакой, у якім ёсць шашкі, шахматы, радыё, свежыя газеты і журналы. Сустракаць маладых байцоў будуць лепшыя малодшыя камандзіры тт. Усціная і Ракуругаў. Рыхтуецца мастацкая самадзейнасць.

Г. Ш.

ВЫПУСКНІКІ

Вострыя разец гоніць барашкавую стружку, Доўга, пакуль не абломіцца, уецца яна спіраллю, а пасля, — бліскучая і гарачая, падае на падлогу.

— Ну, як справы? — пацікавіўся, падышоўшы да станка, інструктар тав. Бабун.

Малады токар-выпускнік С. Клячкоўскі яшчэ раз праверыў мікрометрам абточваемы болт і, задаволена ўсміхнуўшыся адказаў:

— Усё ў парадку.

Яшчэ займаючыся ў школе, Клячкоўскі марыў стаць токарам. Цяпер мара здзейснілася. На працягу вучобы ў фабзавучы ён прагна авалодваў тэхнікай такарнай справы.

Школа прывіла любоў да працы, уменне ва ўзорным парадку трымаць рабочае месца і інструмент.

Старыя кадравыя рабочыя, выступаючыя інструктарамі, перадавалі вучням свой багаты вытворчы вопыт, свае веды.

— Сваю прафесію трэба любіць, — вучыць стары каваль Ю. Грын. —Тады мастаком сваёй справы стаць можна.

Ён вучыць сваіх выхаванцаў пасканала авалодаць спецыяльнасцю. Выпускнік-каваль А. Белайц успамінае, як ён упершыню прышоў у кузню. Інструктар тав. Грын сустрэў яго ветліва:

— Смялей заходзь! — падбадзёраваў ён. — Твая гэта цяпер кузня. Тут будзеш вучыцца.

Адзін за другім праходзілі дні. Яны прыносілі многа цікавага. Прафесія каваля станавілася бліжэй, зразумелай, любімай. Ахвотна пазнаваў Белайц усе яе «тайны». Ясна і даходліва тлумачыў кожную дробязь інструктар. Радасці не было канца, калі Белайц выцягнуў з-пад молата першы роўны квадрат.

— Малайчына, — пахваліў інструктар маладога каваля.—З цябе, брат, будзе толк.

Цяпер Белайц заканчвае курс вучобы. Вынікі выдатныя. Ён выконвае самыя адказныя і цяжкія заказы.

Нездарма тав. Грын гаворыць:

— Упэўнен, што выхаванцы мае не асаромяць мяне, старога.

Так. Яны не асаромяць! Фабзавуч заслужана ганарыцца выпускнікамі— Белайц, Сальніцкім, Брудовіч, Рымарчуком. Добрыя кавалі!

І не толькі кавалі. Гродненская школа фабрычна-заводскага навучання металістаў выпусцае новы атрад маладых кваліфікаваных рабочых: слесараў-зборшчыкаў, фрэзеройшчыкаў, стругальшчыкаў, малыршчыкаў. Усяго — 64 чалавекі. Яшчэ некалькі дзён, і яны пойдуць на вытворчасць, на самастойную работу.

С. Партной.
г. Гродна.

ФАБРЫЧНАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЯКАСЦЬ

На тэкстыльных фабрыках у Беластоку да ўстанаўлення савецкай улады мала звярталася ўвагі на якасць выпускаемай прадукцыі. Асноўная мэта фабрыканта была пераважна гандлярная—пабольш зышчэ з рабочага, выгадна для сябе збыць тавар, зрабіць яго знешне прыгожым, зусім не клапоцячыся аб моцнасці. Вось характэрны прыклад. У былога фабрыканта быў дзінамаметр для вызначэння моцнасці матэрыялаў. Але ім карысталіся толькі пры выкананні заказаў ваеннага ведамства, увесь астатні тавар вырабляўся з рыззя, ніякім выпрабаванням на моцнасць не падвяргаўся.

Пры савецкай уладзе становішча ў корані змянілася. Любая галіна вытворчасці, у тым ліку і тэкстыльная, грунтуецца на абаснаваных навуковых даных, і таму лабараторыі на нашых прадпрыемствах адыгрываюць вялікую ролю ў барацьбе за высокую якасць прадукцыі.

Лабараторыя на 2-ім тэкстыльным камбінаце была створана ў вельмі цяжкіх умовах. Спачатку нам прышлося будаваць яе літаральна без усякіх тэхнічных прыстасаванняў. На першых парах у нас адсутнічала абсталяванне. Нам выдзелілі вельмі маленькае памяшканне для лабараторыі. Але не гледзячы на ўсе цяжкасці ў нашай рабоце, работнікі лабараторыі робяць вялікую і карысную справу. Адначасова мы ўвесь час дабіваліся лабараторнага абсталявання. І, нарэшце, лабараторыя ў асноўным забяспечана ўсім неабходным для кантролю і праверкі цэхаў у справе далейшага павышэння якасці тавараў. Мы маем дзінамаметры для вызначэння моцнасці гатовага тавару і пражы, прылады для вызначэння нумару пражы. Мы таксама вызначаем вільготнасць сыравіны, сурвя, гатовага тавару, вызначаем утрыманне расліных валокнаў у змесцы, робім пробныя афарбоўкі і іншае.

Кожны дзень начальнік аддзела тэхнічнага кантролю атрымлівае ад лабараторыі зводкі аб стандартнасці гатовага тавару. Адзін час тавар па шчыльнасці не вытрымліваў стандартнасці. Калі ў Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 ліпеня аб адказнасці за брак стандартная шчыльнасць па ўтку была адзінкавай з'явай, то цяпер малюнак рэзка змяніўся. Нестандартная моцнасць па ўтку сустракаецца вельмі рэдка, ў гэтым немалую ролю адыграла наша лабараторыя. На моцнасць наш тавар вышэй стандарта. Указ садзейнічаў паляпшэнню якасці выпускаемага тавару. Калі ў жніўні камбінат выпускаў 75 працэнтаў прадукцыі першага сорту, то ў верасні ён даваў ужо 81,9 працэнта першасортнай прадукцыі. А на 15 кастрычніка — пры плане ў 86,8 працэнта камбінат даў 92,3 першасортнай прадукцыі.

Некаторыя таварышы, якія працавалі на вытворчасці дзесяткі год, на першых парах не разумелі велізарнага значэння нашай фабрычнай лабараторыі. Для чаго яна? — пыталі яны. Паступова гэта думка рассейвалася, дзякуючы той рабоце, якую праводзіць лабараторыя ў барацьбе за якасць выпускаемай прадукцыі.

Далейшая наша работа павінна ісці па лініі большага выпуску прадукцыі і лепшай якасці. Нам трэба дабіцца таго, каб наша лабараторыя стала люстрам вытворчасці. У нас ёсць усе ўмовы для гэтага.

Е. Цэпляева,
загадчык лабараторыі 2-га камбіната.

В. Пазнанскі,
хімік-лабарант.

ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ—ОРГАНЫ НАРОДА ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫБАРАЎ

Рабочыя буйных фабрык і заводаў, сходы сялян-калгаснікаў і працоўнай інтэлігенцыі вылучылі прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных у абласную выбарчую камісію. Вылучаючы таксама прадстаўнікоў народа ў раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя выбарчыя камісіі. У састаў гэтых камісій увахозяць найлепшыя сыны і дочкі народа, патрыёты сацыялістычнай радзімы, верныя і выпрабаваныя члены партыі большэвікоў, лепшыя рабочыя стаханаўцы, актывісты калгасаў і вёсак, заслужаныя дзеячы навукі і мастацтва.

Роля выбарчых камісій вельмі вялікая. Выбарчыя камісіі наглядаюць за няўхільным выкананнем Палажэння аб выбарах, разглядаюць скаргі на няправільныя дзеянні ў ходзе выбараў, сочаць за састаўленнем і своечасовым давядзеннем да ўсеагульнага ведама спіскаў выбаршчыкаў, рэгістрыруюць кандыдатаў, падрыхтоўваюць выбарчыя бюлетэні і падлічваюць галасы.

Ад работы выбарчых камісій у значнай меры залежыць ход і поспех выбараў. Вось чаму ў састаў выбарчых камісій народ вылучае людзей, якіх добра ведае, якім давярае, людзей, якія будуць цвёрда стаяць на ахове інтарэсаў народа і правільна праводзяць выбары згодна з дэмакратычнымі прынцыпамі Сталінскай Канстытуцыі.

Каго вылучыў народ у абласную выбарчую камісію? Перш за ўсё кіраўнікоў партыйных і савецкіх работнікаў — сакратара абкома КП(б)Б тав. А. Кільбіна і сакратара аблвыканкома тав. П. Зубовіча. Побач з імі вылучаны рабочыя і работніцы з фабрык, актыўныя грамадскія працаўнікі і стаханаўцы: тав. М. Каліноўскі (3-і тэкстыльны камбінат), І. Якубоўская (1-ы тэкстыльны камбінат), чыгуначнік-стаханавец, памочнік машыніста тав. Л. Партынскі, былы палітзняволены. Сярод вылучаных — вядомы беларускі паэт тав. Ф. Пестрак, які 11 год таміўся ў польскіх турмах, а цяпер з'яўляецца дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР тав. І. Турлейскі, праслаўлены сваімі гераічнымі паводзінамі перад судом капіталістаў старшыня абкома МОПР'а тав. Рэгіна Каплан, прадстаўніца сялян дэпутат Вярхоўнага Савета БССР і старшыня лепшага ў вобласці калгаса імені Сталіна тав. Еўдакія Максімюк.

Гэтыя прозвішчы гавораць самі за сябе. Гэта знатныя людзі нашай вобласці, гэта кроў ад крыві і плоць ад плоці працоўных, іх найлепшыя сыны і дочкі. Няма сумнення, што гэтыя людзі апраўдаюць аказанае ім давер'е і правільна правядуць выбары згодна з інтарэсамі народа. Непарушнасць савецкага, самага дэмакратычнага ў свеце, выбарчага закона забяспечваецца 120 і 121 артыкуламі Палажэння аб выбарах.

Нічога падобнага няма ў капіталістычных краінах, нават найбольш дэмакратычных. Буржуазная дэмакратыя, пісаў В. І. Ленін, «заўсёды астаецца — і пры капіталізме не можа не аставацца — вузкай, урэзанай, фальшывай, ліцамернай, раем для багатых, лавушкай і ашуканствам для эксплаатуемых, для бедных».

У былой Польшчы члены выбарчых камісій не вылучаліся народам, грамадскімі арганізацыямі. Члены гэтых камісій назначаліся ваяводамі са згоды міністэрства ўнутраных спраў. Састаў выбарчых камісій старанна падбіраўся ўрадавымі органамі. У камісіі маглі трапіць толькі давераныя асобы ўрада, спецыялісты па ашуканству выбаршчыкаў і фальсіфікацыі вынікаў галасавання. Зразумела, што такі састаў выбарчых камісій забяспечваў класавыя інтарэсы капіталістаў і памешчыкаў, іх правячай клікі. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, састаў акруговых выбарчых камісій на выбарах у гарадскую раду у маі 1939 года у горадзе Беластоку. Вось спісак старшынь і намеснікаў старшынь гэтых камісій:

Клепачка С. — дырэктар Польскага Банка, Дыка З. — намеснік дырэктара Польскага Банка, Рашчынскі С. — намеснік дырэктара Банка Краёвай Гаспадаркі (Б. Г. К.), Высоцкі Л. — дырэктар Камунальнай Ашчаднай Касы (ККО), Леман Г. — намеснік дырэктара Земельнага Банка і т. д., і т. д. —усяго 14 чалавек.

Хто гэтыя людзі? Сярод іх —5 фінансавых тузоў, кіраўнікоў дзяржаўных банкаў, тысячамі ніцяў звязаных з мясцовым капіталам і прадстаўляючых яго інтарэсы, два багачы — уладальнікі аптэк, 7 прадстаўнікоў урадавай клікі, у тым ліку 5 вышэйшых чыноўнікаў. Класава-капіталістычнае аблічча гэтай камісіі відавочна.

Мы не будзем затрымлівацца на тым, якімі метадамі і спосабамі праводзіліся выбары ў мясцовыя органы «самаўпраўлення» у былой Польшчы. Да гэтага пытання мы яшчэ вернемся. Трэба толькі сказаць некалькі слоў аб «цудах» у час падліку галасоў.

Яркім прыкладам можа паслужыць Супрасль. 14 мая 1939 года адбыліся ў гэтым рабочым пасёлку выбары ў гарадскую раду. У выбары іх на 14 членаў гарадской рады прайшло аж 12 кандыдатаў урадавага спіска. Ці супраслеўскія рабочыя галасавалі такой любоўю за пануючай клікі? Не! Гэта было ашчэ з «цудаў» над урнай», зробленае лоўкімі рукамі адпаведна падабранай выбарчай камісіі.

Аказваецца, што падлік галасоў праводзіўся ў Супраслі вельмі своеасабліва. Прысутнічалі пры гэтым прадстаўнік старосты і мясцовы бурмістр Харашуха. Падлік галасоў праводзіўся на двух прыстаўленых сталах. У пэўны момант пагасла электрычнасць. Узнікла сумятня. Бюлетэні пераносіліся з аднаго стала на другі, і, пры дзейнай дапамозе прысутных прадстаўнікоў улады і членаў выбарчай камісіі, адбылося «цуда»: значна ўзраслі галасы за ўрадавы спісак за кошт астатніх. Але гэтага было мала— манцёр, як відаць, занадта паспяшыў уключыць святло. Тады старшыня выбарчай камісіі зноў перарваў падлік галасоў. Што рабілася ў час перапынку — гісторыя ўмоўчвае. Вядома толькі, што калі камісія зноў прыступіла да работы, урадавы галасы зноў узраслі. Як бачна, яны ўзрасталі ў цемнаце, як грыбы пад дажджом...

Так фальсіфіцыравалі выбары ў былой панскай Польшчы. Буржуазія гнусная выбарчае ашуканства выдавала за дэмакратыю.

Толькі ў краіне сацыялізма — СССР—на справе ажыццёўлена поўная, сацыялістычная дэмакратыя. Савецкая выбарчая сістэма забяспечвае непасрэдны і шырокі ўдзел самога насельніцтва ў арганізацыі і кіраўніцтве выбараў. Сам народ праз сваіх прадстаўнікоў, вылучаных ім у выбарчыя камісіі, ажыццяўляе кіраўніцтва выбарамі ў органы сваёй, савецкай улады. Працоўныя пасылаюць у гэтыя камісіі сваіх лепшых сыноў і дачок, людзей, якія сваім жыццём і дзейнасцю заказалі сваю адданасць народу і сацыялістычнай радзіме. Гэта сапраўды дэмакратычная сістэма выбараў забяспечана вялікай Сталінскай Канстытуцыяй.

М. Навагрудскі.

Работа магазінаў у святочныя дні

Беластоцкі гарвыканком распрацаваў план па абслугоўванню працоўных гандлёвай сеткай у дні святкавання XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

У ноч з 6 на 7 лістапада харчовыя магазіны будуць працаваць да 3 гадзін ночы. 7 лістапада будуць гандляваць усе гарадскія хлебныя магазіны і 17 харчовых. 8 лістапада будуць нармальна працаваць усе хлебныя і харчовыя магазіны і адзін промтагарны.

У святочныя дні на дзве гадзіны павялічваецца час работы сталовых, кафэ і рэстаранаў. Акрамя таго, рэстаран «Еўропа», які днямі адкрываецца, з 7 на 8 лістапада будзе працаваць усю ноч.

Для лепшага абслугоўвання працоўных, якія ўдзельнічаюць у дэманстрацыі, будуць арганізаваны палаткі па продажу харчовых прадуктаў.

Да святочных дзён працоўныя горада атрымаюць шырокі асартымент булачных і кандзцерскіх вырабаў.

Гутарка з чытачом

Як партыя большэвікоў падрыхтоўвала Вялікую Кастрычніцкую соцыялістычную рэволюцыю

(ДЗЕННІК ВАЖНЕЙШЫХ ПАДЗЕЙ 1917 ГОДА)

I.

Аб Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі 1917 года ў Расіі В. І. Ленін даведаўся з буржуазных газет, будучы ў эміграцыі ў Швейцарыі. Пасля першых вестак аб звяржэнні паўстаўшымі рабочымі і сялянамі расійскага самадзяржаўя, Владзімір Ільіч у сваіх «Пісьмах здалёку» пісаў партыі і рабочым Расіі:

«Рабочыя! Вы праявілі цуды пролетарскага, народнага гераізма ў грамадзянскай вайне супроць царызма. Вы павінны праявіць цуды пролетарскай і агульнанароднай арганізацыі, каб падрыхтаваць сваю перамогу ў другім этапе рэволюцыі». (Ленін, том 20, стар. 19).

Томячыся ў далёкай Швейцарыі, Ленін рваўся на радзіму, гарэў жаданнем хутчэй прыняць непасрэдны ўдзел у пачаўшайся і ўсё шырэй і шырэй развіваючайся рэволюцыі. У сваіх пісьмах Владзімір Ільіч нястомна заклікае партыю не даць абмануць сябе «рэволюцыйнай фразіялогіяй» эсэраў, меншавікоў і кадэтаў, не спыняцца на дасягнутых поспехах, а рыхтавацца да другога этапа рэволюцыі,—да рэволюцыі соцыялістычнай. Ён пісаў: «Зараз—дабівацъ рэакцыю, **ні цені** давер'я і падтрымкі новаму ўраду (Часоваму ўраду.—**П. К.**) ні цені давер'я Керэнскаму, Гвазадзёву, Чхенкелі, Чхеідзе і Ко **і ўзброенае выжыданне, узброеная падрыхтоўка** больш **шырокай** базы для больш **высокага** этапа». (Ленін, том. 20, стар. 8).

Пасля доўгіх вандраванняў В. І. Леніну з групай іншых палітэмігрантаў удаецца, нарэшце, прарвацца праз граніцу і 3 (16) красавіка 1917 года прыехаць у Петраград.

На плошчы ля Фінскага вакзала тысячы рабочых, салдат і матросаў сабраліся сустракаць свайго правадыра—Владзіміра Ільіча Леніна.

Паяўленне Владзіміра Ільіча было сустрэта грамавым «ура», яго падхапілі на рукі і паднялі на бранявік, з якога Ільіч сказаў сваю прамову аб рэволюцыі. Гэту прамову ён закончыў словамі: «Няхай жыве соцыялістычная рэволюцыя!»

II.

12 (25) сакавіка 1917 года звярнуўся з ссылкі ў Петраград лепшы вучань і верны саратнік Леніна — таварыш Сталін. Прыезд таварыша Сталіна ў Петраград меў велізарнейшае значэнне для рэволюцыі. Трэба было даць адказы на цэлы рад важнейшых пытанняў рэволюцыі. І таварыш Сталін, апіраючыся на рэволюцыйную тэорыю марксізма-ленінізма і на аналіз падзей, у сваіх артыкулах у «Праўдзе» дае адказы на гэтыя пытанні (першыя артыкулы таварыша Сталіна былі надрукаваны ў «Праўдзе» 14 сакавіка).

Сваёй велізарнейшай работай таварыш Сталін у выключна складанай абстаноўцы згуртоўвае партыю, высоўваючы зразумелыя для шырокіх працоўных мас лозунгі. Так, гаворачы аб Советах і іх ролі ва ўмовах двоеўладдзя, таварыш Сталін заклікае «зрабіць іх паўсямясцовымі, звязаць іх паміж сабой на чале з Цэнтральным Советам Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, як органам рэволюцыйнай улады народа».

Таварыш Сталін заклікае да таго, каб рабочыя не ішлі за Часовым урадам, змагаліся за ліквідацыю двоеўладдзя, за ўстанаўленне адной улады Советаў знізу і да верху, якія з'явіліся-б сапраўднымі органамі рэволюцыйнай улады, мабілізуючы «усе жывыя сілы народа супроць контррэволюцыі».

У асобе таварыша Сталіна партыя мела вернага і стойкага кіраўніка, які наносіў сакрушальныя ўдары не толькі меншавікам, эсэрам і кадэтам, але і капітулянтам і здраднікам тыпу Каменева, Зіноўева і іншых. Таварыш Сталін высока трымае сцяг большэвіцкай партыі і збірае армію працоўных для надыходзячых вялікіх баёў.

III.

На другі дзень пасля прыезду ў Петраград, 4 (17) кастрычніка 1917 года, Владзімір Ільіч Ленін выступіў на сходзе большэвікоў з сваімі вядомымі «Красавіцкімі тэзісамі». «Красавіцкія тэзісы» Леніна з'явіліся дакументам найвялікшай гістарычнай важнасці, які вызначыў і даў канкрэтны план барацьбы партыі за перарастанне буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў рэволюцыю соцыялістычную. Гэтыя тэзісы таварыша Леніна чотка вызначалі своеасаблівасць бягучага моманту, з вычарпальнай і дакладнай яснасцю паказалі класавую сутнасць Часовага ўрада, як урада імперыялістычнай буржуазіі і памешчыкаў. Тэзісы ярка паказалі, што Часовы ўрад не можа даць народу ні міру, ні хлеба, ні зямлі. Міру, — таму што ён з'яўляецца ўрадам прадаўжання і ўзмацнення імперыялістычнай вайны, зямлі ён не дасць беззямельным сялянам таму, што зямля з'яўляецца ўласнасцю памешчыкаў і буржуазіі, інтарэсы якіх Часовы ўрад абараняе. Ён не дасць народу і хлеба. Усё гэта народ атрымае толькі тады, калі ён возьме ўладу ў свае рукі. Зыходзячы з гэтага, Владзімір Ільіч высунуў як асноўную задачу ўсёй работы партыі— задачу барацьбы за пераход улады ў рукі Советаў, за выкрыццё імперыялістычнай сутнасці палітыкі Часовага ўрада і барацьбы супроць так званага «рэволюцыйнага абарончніцтва», за выкрыццё здрадніцкай ролі партыі меншавікоў, эсэраў, бунда і іншых агентаў буржуазіі.

В. І. Ленін высунуў у тэзісах патрабаванне канфіскацыі ўсіх памешчыцкіх зямель і нацыяналізацыі ўсёй зямлі, зліццё ўсіх банкаў у адзін агульнанацыянальны банк і ўстанаўленне кантролю над ім з боку Совета рабочых дэпутатаў, увядзенне кантролю над грамадскай вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў.

«Тэзісы Леніна, — гаворыцца ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)»,— мелі велізарнае значэнне для рэволюцыі, для далейшай работы партыі. Рэволюцыя азначала найвялікшы пералом у жыцці краіны, і партыя ў новых умовах барацьбы, пасля звяржэння царызма, мела патрэбу ў новай арыентыроўцы, каб смела і ўпэўнена ісці па новай дарозе. Гэтую арыентыроўку давалі партыі тэзісы Леніна.

Красавіцкія тэзісы Леніна давалі геніяльны план барацьбы партыі за пераход ад буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі да рэволюцыі соцыялістычнай, за пераход ад першага этапа рэволюцыі да другога этапа — да этапа соцыялістычнай рэволюцыі». («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 177).

24 красавіка (7 мая) пачала сваю работу VII красавіцкая канферэнцыя нашай партыі, якая абмеркавала ўсе асноўныя пытанні вайны і рэволюцыі і прыняла па іх адпаведныя рашэнні.

Па асноўных пытаннях работы канферэнцыі з дакладам выступілі Ленін і Сталін. Владзімір Ільіч, выступаючы з дакладамі і прамовамі на канферэнцыі, падрабязна развіў палажэнні Красавіцкіх тэзісаў.

Супроць тэзісаў Леніна на канферэнцыі выступілі, цяпер выкрытыя і расстрэляныя, ворагі народа Каменеў, Зіноўеў, Рыкаў. Але дэлегаты канферэнцыі аднадушна адхілілі прапановы гэтых капітулянтаў і прынялі план Леніна.

З дакладам па нацыянальнаму пытанню выступіў на канферэнцыі таварыш Сталін, які адстойваў праграму партыі па нацыянальнаму пытанню. У сваім дакладзе таварыш Сталін адстойваў праграмнае палажэнне нашай партыі аб праве нацый на самавызначэнне і роўнаправе нацый.

Сваімі рашэннямі Красавіцкая канферэнцыя нашай партыі нацэліла партыю на барацьбу за перарастанне буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў рэволюцыю соцыялістычную.

IV.

3 (16) чэрвеня пачаў сваю работу першы Ўсерасійскі з'езд Советаў Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў. На гэтым з'ездзе большэвіцкая партыя прадстаўляла яшчэ меншасць. У кіраўніцтве работай з'езда былі меншавікі і эсэры, якія ўсімі сіламі стараліся ўгаварыць масы ісці ў саюзе з буржуазіяй і падтрымліваць Часовы ўрад і яго палітыку. Выступаўшыя на з'ездзе меншавіцкія прамоўцы сцвярджалі, што «нельга кіраваць краінай без згоды з буржуазіяй». У сваіх выступленнях яны заклікалі салдат працягваць імперыялістычную вайну да пераможнага канца, угаварвалі не адбіраць у памешчыкаў зямлі да рашэння ўстаноўчага схода, тэрмін склікання якога нават яшчэ не быў устаноўлены.

Адзін з меншавіцкіх прамоўцаў на з'ездзе заявіў, што «няма такой партыі, якая ўзяла-б адна ў свае рукі ўладу». Але ў гэты час у радах прысутных на з'ездзе раздаўся спакойны, гучны голас: «Ёсць такая партыя!» Гэта гаварыў Владзімір Ільіч Ленін. Ён вышаў на трыбуну і пачаў проста і пераканаўча растлумачваць, што сабой прадстаўляе Часовы ўрад і інтарэсы якіх класаў ён абараняе, чаму нельга ісці ў саюзе з буржуазіяй. Простыя і зразумелыя словы Леніна аб тым, чаго хочуць большэвікі, як могуць дабіцца працоўныя міру, зямлі, хлеба,—з напружанай увагай слухалі рабочыя, салдаты і сяляне. Усё больш і больш яны пачыналі разумець, як іх ашукваюць меншавікі і эсэры. Прамовы, сказаныя Владзімірам Ільічом з трыбуны першага Ўсерасійскага з'езда Советаў, мелі велізарнейшы ўплыў на далейшае рэволюцыянізіраванне мас і адыход мас ад партый меншавікоў і эсэраў пад сцягі большэвіцкай партыі, пад сцягі барацьбы за соцыялістычную рэволюцыю.

Дэманстрацыя, якая адбылася ў Петраградзе 18 чэрвеня (1 ліпеня), налічваўшая каля 500 тысяч чалавек, праходзіла пад большэвіцкімі лозунгамі: «Уся ўлада Советам!». Яна паказала, што сілы соцыялістычнай рэволюцыі растуць, што соцыялістычная рэволюцыя набліжаецца.

V.

3 (16) ліпеня ў Петраградзе пачаўся стыхійны рух рабочых і салдат, які перарос у велізарную ўзброеную дэманстрацыю пад лозунгамі пераходу ўлады ў рукі Советаў. Гэта дэманстрацыя з'явілася вынікам усё больш і больш нарастаючага нездаволення мас палітыкай Часовага ўрада, нарастаннем нянавісці мас да капіталістаў і памешчыкаў, ростам рэволюцыйнасці мас. Уся папярэдняя работа нашай партыі па растлумачэнню масам задач рэволюцыі, класавай сутнасці Часовага ўрада і яго палітыкі, тактыкі меншавікоў і эсэраў як агентаў буржуазіі, давала свае рэзультаты. Масы на вопыце пераконваліся ў праваце большэвікоў і пераходзілі на бок большэвіцкай партыі. Гэта добра разумелі і ворагі рэволюцыі. Іменна таму яны і сабралі свае контррэволюцыйныя сілы для таго, каб разагнаць Советы, разграміць арганізатара мас—большэвіцкую партыю і задушыць нарастаючую рэволюцыю. З гэтай мэтай яны сцягвалі к сэрцу рэволюцыі—Петраграду рэакцыйна-настроеныя вайсковыя часці з тым, даб у першы зручны момант абрушыцца на рэволюцыйны Петраград.

І пасля таго, як пачаўшаеся па загаду Часовага ўрада ўсеагульнае наступленне на фронце ганебна правалілася, армія, дрэнна ўзброеная, раздзетая і галодная, пацярпела жорсткае паражэнне, цярпенню рэволюцыйных мас прышоў канец. Рабочыя і салдаты Петраграда стыхійна вышлі на вуліцу. Партыя большэвікоў, Ленін і Сталін у гэты час былі супроць выступлення, бо яны ўлічвалі, што працоўныя ўсёй краіны яшчэ не падрыхтаваны да захвату ўлады і што гэта выкарыстае контррэволюцыя для таго, каб разграміць рэволюцыйны Петраград і абрушыцца на рэволюцыю. Але ўтрымаць масы ад выступлення партыя была не ў сілах. Тады партыя рашыла ўзначаліць дэманстрацыю і надаць ёй мірны характар. Таварыш Сталін гаворыць: «Выступленне разыгралася. Ці мела партыя права ўмыць рукі ў выступленні пролетарыята і салдат і адыйсці ў бок? ...Умыць рукі мы не мелі права; як партыя пролетарыята, мы павінны былі ўмяшацца ў яго выступленне і надаць яму мірны і арганізаваны характар, не задаваючыся мэтай узброенага захвату ўлады».

Не гледзячы на тое, што гэта дэманстрацыя насіла мірны характар, яна была расстраляна контррэволюцыйнымі войскамі па загаду Часовага ўрада.

Пачалася расправа над рэволюцыйнымі рабочымі і салдатамі. Контррэволюцыя абрушылася на нашу партыю, разграміла рэдакцыю «Праўды», друкарню «Труд» і ўстановы партыі. Часовы ўрад аддаў загад аб арышце Леніна і аб яго забойстве.

Расстрэлам ліпеньскай дэманстрацыі буржуазія і памешчыкі пры актыўнай дапамозе меншавікоў і эсэраў пачалі актыўнае наступленне на рэволюцыю. Ліпеньскія падзеі паказалі, што мірны перыяд рэволюцыі скончыўся, што перыяд двоеўладдзя закончыўся ў карысць аднаўладдзя буржуазіі і памешчыкаў. Партыя большэвікоў была загнана ў падполле. Пачалася ліквідацыя рэволюцыйных завяяванняў мас. Абстаноўка ў краіне змянілася, бо ў парадак дня быў пастаўлен штык. У гэтай змяніўшайся абстаноўцы партыя павінна была змяніць сваю тактыку ў барацьбе за соцыялістычную рэволюцыю. Таварыш Сталін, ацэньваючы змяніўшуюся абстаноўку ў краіне пасля ліпеньскіх падзей, на VI з'ездзе партыі гаварыў: «Мірны перыяд рэволюцыі скончыўся. Наступіў перыяд нямірны, перыяд схватак і ўзрываў».

Але ліпеньскія падзеі нельга разглядаць як паражэнне пачаўшагася руху. Гэта была свайго роду перамога, бо падаўленне ліпеньскай дэманстрацыі ўзмацніла працэс адыходу мас ад лідэраў дробна-буржуазных партый, дапамагаўшых буржуазіі. Масы ішлі пад сцягі большэвікоў.

VI.

26 ліпеня (8 жніўня) 1917 года пачаў сваю работу VI з'езд нашай партыі. Гэты з'езд увайшоў у гісторыю як адна з найвялікшых дат у барацьбе партыі за соцыялістычную рэволюцыю.

З'езд сабраўся ў абстаноўцы раз'юшанага цкавання большэвікоў і вымушан быў праходзіць у падполлі. Владзімір Ільіч Ленін на з'ездзе не прысутнічаў. Непасрэдна работай з'езда кіраваў таварыш Сталін. Асноўная задача VI з'езда заключалася ў тым, каб у новай абстаноўцы даць партыі новую тактыку, новыя лозунгі ў барацьбе за соцыялістычную рэволюцыю.

Асноўнымі пытаннямі работы з'езда былі даклады таварыша Сталіна аб рабоце ЦК партыі і аб палітычным становішчы. У гэтых дакладах таварыш Сталін з выключнай чоткасцю і велізарнай глыбінёй даў аналіз развіцця рэволюцыі, даказаў, што пытанне аб соцыялістычнай рэволюцыі ў нашай краіне пастаўлена гістарычным ходам развіцця не як пытанне якойсьці аддаленай будучыні, а як пытанне непасрэднае, пытанне сённяшняга дня. Развіццё рэволюцыі ўжо дайшло да таго, што рэволюцыя пачала прымаць соцыялістычны характар. Ён гаварыў, што рэволюцыя ставіць пытанне аб умяшанні ў галіну эканамічных адносін у форме кантролю над вытворчасцю, аб перадачы зямлі ў рукі сялянства, аб пераходзе ўлады з рук буржуазіі ў рукі Советаў Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў. Усё гэта вызначае глыбокі характар нашай рэволюцыі. Яна стала прымаць характар соцыялістычнай рабочай рэволюцыі.

Сваімі дакладамі таварыш Сталін нанёс сакрушальны ўдар ныцікам і малаверам, якія сцвярджалі, што Расія не падрыхтавана да соцыялістычнай рэволюцыі. Таварыш Сталін даў ясную перспектыву развіцця соцыялістычнай рэволюцыі ў нашай краіне.

Гаворачы аб змяненнях абстаноўкі ў краіне пасля ліпеньскіх падзей у Петраградзе, таварыш Сталін падкрэсліў, што перыяд двоеўладдзя скончыўся, што ўлада знаходзіцца ў руках буржуазнага Часовага ўрада, што перыяд мірнага развіцця рэволюцыі змяніўся перыядам нямірным. «Астаецца, — гаварыў таварыш Сталін,—адно — узяць уладу сілай, звергнуўшы Часовы ўрад. Але ўзяць уладу сілай можа толькі пролетарыят у саюзе з вясковай беднатой». («Кароткі курс», стар. 188).

Советы, у кіраўніцтве якіх усё яшчэ стаялі меншавікі і эсэры, скаціліся ў балота пасобнікаў буржуазіі. Зыходзячы з гэтага, таварыш Сталін, апіраючыся на аналіз абстаноўкі ў краіне і ўказанні Владзіміра Ільіча, прапанаваў з'езду часова зняць лозунг «Уся ўлада Советам!» і замяніць яго лозунгам «Пераход улады ў рукі пролетарыята і беднейшай часткі сялянства». Гэта не значыла, зразумела, што большэвікі адказаліся ад Советаў як формы рэволюцыйнай улады наогул. Справа датычылася даных советаў, у кіраўніцтве якіх стаялі меншавікі. Советы павінны будуць адраджацца і адроджацца тады, калі большасць у іх пярэйдзе да большэвікоў.

VI з'езд, уся партыя з велізарным натхненнем прынялі даклады таварыша Сталіна. Даклады далі ясны план барацьбы за соцыялістычную рэволюцыю ў новых умовах, якія склаліся пасля ліпеньскіх дзён.

З'езд звярнуўся да рабочых, салдат і сялян з маніфестам, які заканчваўся наступнымі словамі: «Рыхтуйцеся-ж да новых бітваў, нашы баявыя таварышы! Стойка, мужна і спакойна, не паддаючыся на правакацыю, капіце сілы, стройцеся ў баявыя калоны! Пад сцяг партыі, пролетарыі і салдаты! Пад наш сцяг, прыгнечаныя вёскі!» (Ленін т. 21, стар. 484).

Аб значэнні VI з'езда нашай партыі ў падрыхтоўцы да соцыялістычнай рэволюцыі ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)» гаворыцца:

«VI з'езд нацэльвае партыю на ўзброенае паўстанне супроць буржуазіі і яе Часовага ўрада» (стар. 214).

VII.

Бачачы, што ніякія намаганні контррэволюцыі не змаглі затрымаць нарастаючую рэволюцыю, буржуазія рыхтуе контррэволюцыйны пераварот, у кіраўніцтва якім яна ставіць генерала Карнілава. Карнілаў разлічваў моцнай вайсковай групай, якая складалася з рэакцыйна настроеных часцей, нечакана пайсці на Петраград і іншыя важнейшыя рэволюцыйныя цэнтры і задушыць рэволюцыю. У яго планах было — разгон Советаў і іншых масавых рэволюцыйных арганізацый і ўстанаўленне царызма ў Расіі.

25 жніўня (7 верасня) пачаўся рух карнілаўскіх войск на Петраград у колькасці аднаго кавалерыйскага корпуса.

ЦК партыі большэвікоў, бачачы ў загаворы контррэволюцыі смяротную небяспеку, непасрэдна навіслую над рэволюцыяй, заклікаў масы рабочых, салдат і сялян да актыўнага ўзброенага адпору. У Петраградзе і іншых пунктах узбройваліся тысячы рабочых, вакол Петраграда рыхтаваліся акопы і будаваліся дротавыя загароды. У Карнілаўскія войскі былі пасланы большэвіцкія агітатары для растлумачэння абманутым буржуазіяй і афіцэрамі салдатам замыслаў Карнілава. У рэзультаце энергічных мер, прынятых нашай партыяй, карнілаўскі загавор быў ліквідаваны. Салдаты і казакі карнілаўскіх войск не пайшлі на Петраград.

Арганізацыя карнілаўскага мяцяжу буржуазіяй і разгром яго большэвікамі наглядна паказалі масам, чаго хоча буржуазія і яе пасобнікі— меншавікі і эсэры. Мяцеж паказаў, якія велізарныя сілы тояцца ў народных масах. Працоўныя і салдаты пачалі выганяць з Советаў меншавікоў і эсэраў і пасылаць туды прадстаўнікоў большэвіцкай партыі. Наша партыя хутка заваёўвае на свой бок большасць у Советах, і ўжо 31 жніўня і 5 верасня Петраградскім і Маскоўскім Советамі рабочых і салдацкіх дэпутатаў былі прыняты большэвіцкія рэзалюцыі.

8 (21) верасня выбіраецца большэвіцкі прэзідыум рабочай секцыі петраградскага Совета Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў.

19 верасня (2 кастрычніка) выбіраецца большэвіцкі выканком Советаў у Маскве.

2 (15) кастрычніка Петраградскі Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў выносіць пастанову аб неабходнасці пераходу ўлады ў рукі Советаў і патрабаванне аб пачатку перагавораў аб пераміры на ўсіх франтах.

Советы паўсямясцова пачынаюць пераходзіць у рукі большэвікоў. Яны зноў становяцца органамі рэволюцыйнай арганізацыі мас. Масы рыхтуюцца да ўзброенага паўстання пад лозунгам: «Уся ўлада Советам!»

VIII.

Пасля ліпеньскіх падзей у Петраградзе Владзімір Ільіч Ленін па рашэнню партыі пайшоў у падполле. Ён спачатку хаваўся ад агентаў контррэволюцыі ў Петраградзе, а затым пераехаў у Фінляндыю. З падполля ён праз таварыша Сталіна кіраваў работай VI з'езда партыі.

12 — 14 (25 — 27) верасня Владзімір Ільіч піша два пісьмы ў ЦК, Петраградскаму і Маскоўскаму камітэтам партыі. У пісьме «Большэвікі павінны ўзяць уладу» ён піша:

«Атрымаўшы большасць у абодвух сталічных советах Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, большэвікі могуць і павінны ўзяць дзяржаўную ўладу ў свае рукі».

Ён патрабуе ўсебакова ўсё прадумаць, памятаючы, што «паўстанне ёсць майстэрства» і папярэджвае, што «гісторыя не даруе нам, калі мы не возьмем улады цяпер».

У другім пісьме «Марксізм і паўстанне» Владзімір Ільіч вучыць, як падрыхтоўваць і арганізоўваць паўстанне.

29 верасня (12 кастрычніка) Владзімір Ільіч піша артыкул «Крызіс наспеў» (надрукавана 7 (20) кастрычніка 1917 года), у якім з страсным перакананнем і рэволюцыйнай рашучасцю заклікае партыю і рабочы клас на паўстанне.

Ён гаворыць: «Усё будучае рускай рэволюцыі пастаўлена на карту. Уся чэсць партыі большэвікоў стаіць пад пытаннем. Усё будучае міжнароднай рабочай рэволюцыі за соцыялізм пастаўлена на карту. Крызіс наспеў...» (Ленін, том 21, стар. 239).

3 (16) кастрычніка ЦК партыі дае згоду на зварот Владзіміра Ільіча Леніна ў Петраград, куды ён і прыязджае 9 (22) кастрычніка. З першага дня свайго прыбыцця ў Петраград Ленін стаў на чале падрыхтоўваемага ўзброенага паўстання. 10 (23) кастрычніка ён прысутнічае на пасяджэнні ЦК партыі, дзе прымаецца рэзалюцыя аб падрыхтоўцы ўзброенага паўстання.

П. КЛЯШЭНЬ,
лектар Беластоцкага абкома партыі.



Выступленне В. І. Леніна на Красавіцкай канферэнцыі РСДРП(б) 7 мая (24 красавіка) 1917 года. З рысунка мастака П. Васільева. Фота ТАСС.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 23 кастрычніка. (ТАСС). Гарманскае інфармацыйнае бюро перадае зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі:

На працягу дня германскія эскадрыллі лёгкіх бамбардыроўшчыкаў паспяхова бамбардыравалі Лондан і іншыя гарады Англіі. З наступленнем цемнаты ўступілі ў дзеянне эскадрыллі цяжкіх бамбардыроўшчыкаў, якія працягвалі налёты на англійскую сталіцу і іншыя цэнтры англійскай ваеннай прамысловасці. Па абодвух баках Тэмзы ўспыхнулі новыя пажары. У Кавентры і Бірмінгаме важныя ваенныя заводы атрымалі цяжкія пашкоджанні.

Учора непрыяцельскія самалёты не зрабілі налётаў на тэрыторыю Германіі. Як паведамлялася ўжо, у паветраным баі збіта тры англійскіх знішчальнікі. Два германскіх самалёты прапалі без весткі.

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

НЬЮ-ЙОРК, 23 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што ноч з 22 на 23 кастрычніка была адной з самых спакойных з пачатку налётаў германскай авіяцыі на Англію. У гэту ноч толькі нямногія германскія самалёты прарваліся к Лондану, дзе яны скінулі некалькі бомб.

Адзначаецца, што 23 кастрычніка ў абароне Лондана ўдзельнічалі новыя самалёты, прыбыўшыя ў Англію з ЗША.

Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, англійскія берагавыя батарэі ўчора ў трэці раз абстралялі праліў Па-дэ-Кале. 22 кастрычніка раніцой у Лондане не было паветранай трывогі. Германскія самалёты зрабілі напад на паўднёва-ўсходнюю і цэнтральную частку Англіі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ АНГЛІЙСКАГА ПАВЕТРАНАГА НАЛЁТУ НА БЕРЛІН

ЛОНДАН, 22 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае камюніке міністэрства авіяцыі, у якім гаворыцца, што англійскія ваенна-паветраныя сілы прадпрынялі ў ноч на 21 кастрычніка два налёты на Берлін. Адначасова з гэтым другія злучэнні англійскай авіяцыі бамбардыравалі ваенныя аб'екты ў Італіі.

Налёты на Берлін працягваліся звыш шасці гадзін. У пачатку першага налёту дзеянні англійскай авіяцыі затрудняліся моцным туманам, з прычыны чаго самалётам прышлося на працягу 30 мінут кружыць над горадам, каб знайсці намечаныя для бамбардыроўкі аб'екты. Пасля наступіўшага праяснення англійскія самалёты беспамылкова знайшлі пры святле месяца вялікі чыгуначны склад у раёне Моабіта і падверглі яго бамбардыроўцы. Адзначаны прамыя пападанні фугасных і запальваючых бомб. На тэрыторыі склада пачалося 5 пажараў. Другія злучэнні англійскай авіяцыі сканцэнтрыравалі сваю ўвагу на аб'ектах, размешчаных паблізу цэнтра горада, а таксама на прамысловых прадпрыемствах, якія знаходзяцца ў адным з паўночна-заходніх берлінскіх прыгарадаў. Былі зарэгістраваны прамыя пападанні бомб у намечаныя аб'екты. Спусціўшы дзве гадзіны пасля першага налёту пачаўся другі налёт на Берлін. Ясная бачымасць спрыяла аперацыям англійскіх самалётаў. Адзін з гэтых самалётаў, не гледзячы на моцны загараджальны агонь непрыяцельскай зенітнай артылерыі, знізіўся да двух тысяч футаў і затым скінуў бомбы над цэнтрам горада. Як было заўважана, у горадзе ўзніклі вялікія пажары. Скінутыя бомбы ўпалі, у прыватнасці, на Путліц-штрасе і чыгуначныя склады Лерцкага вакзала, таксама на склады ў Шарлотэнбургу.

Англійскія эскадрыллі, якія ўдзельнічалі ў налётах на аўтамабільныя, авіяцыйныя і сталеліцейныя заводы Італіі, зрабілі палёт працяглацю ў 1.600 міль, пры чым ім прышлося ў шляху двойчы перасеч Альпы.

У працэсе начных аперацый над Італіяй, якія пачаліся неўзабаве пасля поўначы, былі бамбардыраваны прамысловыя прадпрыемствы ў Мілане, аўтазавод «Фіят» у Турыне, завод фірмы «Пірэлі» у Сесто Сан Джовані і доменныя печы металургічнага завода ў Аоста.

—«о»—


Арышт Бека ў Румыніі

БЕРЛІН, 23 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Бухарэста, што ў аколіцах Бухарэста арыштаван былы польскі міністр замежных спраў Бек, які меў пры сабе фальшывы пашпарт. Апрача Бека арыштаваны таксама многія члены былой польскай місіі ў Бухарэсце. Іх абвінавачваюць у актыўным удзеле ў падрыхтоўцы актаў сабатажу ў нафтавых раёнах.

Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Бухарэста наступныя падрабязнасці арышту былога польскага міністра замежных спраў Бека. Бек даў абавязацельства не прадпрымаць ніякіх спроб да ўцёкаў. Але ён нарушыў сваё слова, імкнучыся на аўтамабілі выехаць з пункта, які знаходзіцца паблізу Бухарэста, і пакінуць краіну. На дарозе, якая злучае Бухарэст з граніцай, ён хацеў перасесці ў падрыхтаваны для ўцёку аўтамабіль. У гэты момант ён быў схоплен легіянерскай паліцыяй, якая загадзя ведала аб планах Бека. Пры арышце Бек прад'явіў выданы на чужое імя фальшывы англійскі дыпламатычны пашпарт. Але так як гэта не дапамагло, то ён імкнуўся вызваліцца пры дапамозе хабару ў 1,5 мільёна лей.

АРЫШТЫ Ў ІНДЫІ

КАБУЛ, 23 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе індыйская газета «Бамбей кронікл», у сувязі з адбыўшайся сутычкай дэманстрантаў з паліцыяй у Малабарскім раёне (Індыя) арыштаван 141 чалавек, 49 чалавек з іх ужо асуджаны.



У калгасе імені XVII гадавіны Кастрычніка, Лоеўскага раёна, Гомельскай вобласці БССР, атрыман высокі ўраджай капусты. Асобныя качаны важаць 7 кілаграмаў. На здымку: адбор лепшай капусты для здачы дзяржаве.

Фотахроніка БелТА.

ЗВОДКА
аб ходзе ворыва зябліва і ўборкі бульбы па Беластоцкай вобласці на 20 кастрычніка 1940 г.
(У процантах да плана).

№№ п/п	Назва раёнаў	Паднята зябліва	Выкапана бульбы
1.	Аўгустоўскі	98,5	99,3
2.	Беластоцкі	97,9	99,9
3.	Бельскі	90,2	99,5
4.	Бранскі	115,0	99,9
5.	Ваўкавыскі	85,2	95,8
6.	Граеўскі	96,8	100,0
7.	Гродненскі	109,6	65,4
8.	Дамбраўскі	91,9	87,5
9.	Едвабнаўскі	100,0	100,0
10.	Заблудаўскі	101,8	96,8
11.	Замбраўскі	100,6	99,9
12.	Кольнаўскі	167,2	94.5
13.	Крынкаўскі	90,0	90,5
14.	Лапскі	95,7	100,0
15.	Ломжынскі	101,6	87.3
16.	Монькаўскі	105,5	94,7
17.	Парэцкі	70,0	93.1
18.	Свіслацкі	53,0	90,6
19.	Скідэльскі	99.4	99,7
20.	Снядаўскі	105,3	100,0
21.	Сапоцкінскі	91,0	92,6
22.	Саколкаўскі	117.6	96.5
23.	Цэханавецкі	102.5	98.9
24.	Чыжаўскі	104.1	100,0
		99,7	94,0

—«о»—

Паспяхова заканчваюць сельскагаспадарчыя работы

СКІДЭЛЬ. (Ад нашага карэспандэнта). У калгасах Скідэльскага раёна шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Рад перадавых калгасаў раёна, як «Чырвоная Звязда», Дубнаўскага сельсовета, «Большэвік», Скідэльскага сельсовета, імені Сталіна, Загаранскага сельсовета, закончылі ўборку і здачу бульбы дзяржаве.

Паспяхова выканаў свае абавязкі калгас імені Сталіна, Жыдамлянскага сельсовета. Калгас поўнасцю выканаў абавязкі перад дзяржавай па здачы бульбы і заканчвае ўсе віды сельскагаспадарчых работ.

Высока аплачваецца стаханаўская праца калгаснікаў. У сельскагаспадарчай арцелі імені Варашылава на працадзень калгаснікі атрымалі па тры кілограмы збожжа і 12 кілограмаў бульбы. Пры канчатковым разліку мяркуюць выдаць на працадзень па 7 кілограмаў збожжа і 20 кілограмаў бульбы.

Баявая задача перадкастрычніцкага спаборніцтва асоавіяхімаўцаў

Набліжаецца XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Увесь совецкі народ імкнецца адзначыць гэту знамянальную дату новымі слаўнымі справамі, новымі падарункамі маці-радзіме.

Многія асоавіяхімаўскія арганізацыі ўключыліся ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, узялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. За дастойную сустрэчу гадавіны Кастрычніка паспяхова спаборнічае ломжынскі гарадскі Совет Асоавіяхіма з ваўкавыскай асоавіяхімаўскай арганізацыяй.

Аднак трэба адзначыць, што паўнацэнны падарунак Вялікаму Кастрычніку змогуць падрыхтаваць толькі тыя асоавіяхімаўскія арганізацыі, якія ўсвядомілі новыя задачы, стаячыя перад дабравольнымі абароннымі таварыствамі працоўных. Нікому не патрэбны зараз дутыя абавязацельствы па падрыхтоўцы вялікай колькасці значкістаў-стралкоў. Асоавіяхімаўцы калінінскага вагонна-рамонтнага завода зусім правільна падышлі да вызначэння сваіх перадкастрычніцкіх абавязацельстваў. Яны рэальна ўлічылі свае магчымасці і паставілі ў цэнтр увагі высокую якасць ваеннай вучобы, змястоўнасць работы пярвічнай арганізацыі.

Да XXIII гадавіны Кастрычніка мы павінны стварыць сталыя вучэбныя групы, забяспечыць іх граматным кіраўніцтвам і неабходнай матэрыяльнай базай. Вось у гэтым — галоўная задача асоавіяхімаўскіх арганізацый, гэтага патрабуе пераход да новых комплексных праграм і новых форм абучэння, прыбліжаных да армейскіх умоў, каб забяспечыць неабходную якасць і колькасць ваеннай падрыхтоўкі членаў абароннага калектыва.

Кіраўніцтву Беластоцкай вобласці трэба падхапіць заклік калінінцаў і без шуміхі, па-дзелавому ўзяцца за арганізацыю вучэбных падраздзяленняў. Стварэнне ў кожнай асоавіяхімаўскай арганізацыі хоць-бы адной вучэбнай групы — дастойны падарунак да гадавіны. У далейшым у гэтых групах будуць выкоўвацца баявыя рэзервы нашай Чырвонай Арміі, у гэтых групах будуць рыхтаваць сябе да будучых баёў за радзіму совецкія патрыёты. Стварэнне вучэбных груп паслужыць пачаткам рашучага ўмацавання ўсіх звенняў нашага таварыства. На жаль, перабудовы работы Асоавіяхіма пакуль яшчэ не адчуваецца ў нашай вобласці.

У перадкастрычніцкім спаборніцтве асоавіяхімаўцаў не будзе поспеху, калі будзе слаба працаваць абласны совет Асоавіяхіма. Не будзе гэтага поспеху і тады, калі гэту справу не возьмуць у свае рукі партыйныя арганізацыі і ваенныя аддзелы гаркомаў і райкомаў.

А. БАРСУКОЎ,
інструктар ваеннага аддзела абкома КП(б)Б.

Провады прызыўнікоў у Чырвоную Армію

ВАЎКАВЫСК. Па ініцыятыве культурна-масавай камісіі райкома комсамола праведзен вечар провадаў у Чырвоную Армію. На вечар сабраліся прызыўнікі горада і бліжніх сельсоветаў, іх бацькі і знаёмыя.

Ад імя раённага камітэта партыі прызыўнікоў вітаў загадчык ваенным аддзелам тав. Табакоў.

— Вам выпала вялікае шчасце пайсці пад баявыя сцягі Чырвонай Арміі. Прыкладзіце-ж усе свае сілы, каб выдатна авалодаць магутнай баявой тэхнікай і, калі гэта спатрэбіцца, біце ворагаў так, як білі іх вялікія палкаводцы Фрунзе, Чапаеў, Шчорс, Катоўскі. Праводзячы вас, мы жадаем, каб вы былі выдатнікамі баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Ад імя ваенкамата выступіў тав. Праватораў.

Прызыўнік Цімох Сільвестравіч Якушэў, машыніст дэпо станцыі Ваўкавыск, у сваім выступленні заявіў:

— Провады ў Чырвоную Армію з'яўляюцца для нас вялікай урачыстасцю. Мы клянемся, што будзем з дастоінствам насіць пачотнае званне чырвонага воіна.

На мітынгу выступілі таксама прызыўнікі тт. Мушацкі і Бутрым.

— Пасылаючы свайго сына Нікалая ў Чырвоную Армію, — гаворыць у сваім выступленні калгаснік сельгасарцелі «Першае Мая» Грыгорый Панасюк, — я спадзяюся, што ён будзе дастойным байцом Чырвонай Арміі. Адначасова я паднімаю хадайніцтва аб датэрміновым залічэнні ў Чырвоную Армію другога майго сына Сцяпана.

Прысутныя з адабрэннем сустрэлі гэта выступленне 56-гадовага селяніна.

Комсамолка тав. Дзянісава перадала прызыўнікам каштоўныя падарункі.

Вечар закончыўся масавым гуляннем.

К. Сікорын.

* * *

ЛОМЖА. У провадах прынялі ўдзел больш 500 чалавек. На вакзале адбыўся мітынг, на якім выступілі ад райкома партыі тав. Марозаў, сакратар райкома комсамола тав. Еўменаў і рабочы завода сельгасмашын тав. Бжозоўскі.

Стары рабочы, стаханавец тав. Бжозоўскі расказаў аб цяжкім жыцці і паднявольнай працы пры ўладзе польскіх паноў і капіталістаў. Зараз ён працуе на карысць радзімы, з'яўляецца стаханаўцам і выконвае нормы на 170—180 процантаў. Звяртаючыся да прызыўнікоў, тав. Бжозоўскі гаворыць:

— Вы шчаслівыя, што ідзеце служыць у Чырвоную Армію, якая вызваліла нас ад памешчыкаў і капіталістаў. Чэсна служыце нашай радзіме, умацоўвайце магутнасць Чырвонай Арміі, а мы будзем сваёй працай на вытворчасці таксама ўмацоўваць абарону нашай краіны.

У адказным слове малады комсамолец прызыўнік тав. Ярнутоўскі сказаў:

— Я ніколі не забуду гэты радасны дзень. Я шчаслівы тым, што іду служыць у Чырвоную Армію. Даю слова, што апраўдаю ваша давер'е і буду чэсна служыць нашай радзіме.

С. Матвееў.



Лепшая работніца прылаўка ў магазіне № 183 беластоцкага горхарчпромгандлю Е. Я. Барсук сістэматычна выконвае план тавараабароту на 125 процантаў і культурна абслугоўвае пакупнікоў.

Фота А. Сапіра.

Нарада рэдактараў школьных насценгазет

Па ініцыятыве гаркома комсамола 21 кастрычніка ў беластоцкім Доме настаўніка праведзена гарадская нарада рэдактараў школьных насценгазет.

Пасля інструктажу прадстаўніка рэдакцыі газеты «Вольная праца» рэдактары насценгазет 7-й, 8-й, 10-й і іншых школ падзяліліся вопытам сваёй работы, расказалі аб арганізацыі работы рэдкалегій, аб змесце і характары змяшчаемых у насценгазетах матэрыялаў.

У 8-й школе выпушчана ўжо 7 нумароў насценгазеты, у кожным нумары — ад 9 да 16 заметак. Матэрыялы адлюстроўваюць жыццё ўсёй школы. Газета паказвае лепшых вучняў-выдатнікаў, рэзка крытыкуе лодыраў і парушальнікаў дысцыпліны. У насценгазеце ёсць «куток смеху», дзе змяшчаюцца цікавыя шаржы, кароткія, але вострыя па зместу заметкі. Газета 8-й школы стала баявым памочнікам настаўнікаў у арганізацыі вучняў за лепшую вучобу. Адказны рэдактар кіруе двума зменнымі рэдкалегіямі, кожная з якіх падрыхтоўвае нумар газеты на працягу 20 дзён. Такім чынам, газета выходзіць раз у дэкаду. Газета прыгожа аформлена, заметкі друкуюцца на пішучай машынцы.

Рэдкалегія 7-й школы праводзіць вялікую работу з актывам насценкораў, дапамагае класным і атрадным насценгазетам. Праведзен конкурс сярод вучняў на лепшае апавяданне, сістэматычна даецца аддзел задач і галаваломак. 5 лістапада тут будзе наладжана выстаўка ўсіх класных насценгазет школы.

У 10-й школе выпушчаны цікавыя тэматычныя нумары насценгазет, прысвечаныя выбарам піонерскіх органаў, соцыялістычнаму спаборніцтву сярод вучняў, антырэлігійнай рабоце.

Таварышы з 4-й школы скардзіліся на слабую дапамогу ў рабоце рэдкалегіі з боку адказнага за насценгазету выкладчыка фізікі. У гэтай школе выпушчан усяго адзін нумар насценгазеты, ды і ў тым змешчаны выразкі з цэнтральных газет.

Падобныя нарады рэдактараў школьных насценгазет варта практыкаваць і ў далейшым.

А. Н.

Нам. адказнага рэдактара
Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—80. Тыраж—10.000 экз. Друкарня Беластоккруг.